**Наталля ГАНЧАРЭНКА**

# Расійская дзяржава ў XVI стагоддзі

*VIII клас*

*У прапанаванай метадычнай распрацоўцы ўрока прадстаўлена паэтапнае вывучэнне перыяду царавання Івана IV на падставе разнастайнага дадатковага матэрыялу.*

**Мэты ўрока:** плануецца, што пасля вывучэння тэмы вучні будуць *ведаць* асаблівасці ўнутранай і знешняй палітыкі Расійскай дзяржавы ў XVI ст., азначэнне паняццяў: Выбраная рада, апрычніна, Судзебнік, прыказы, Земскі сабор; *умець* устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, характарызаваць асобу і дзейнасць Івана IV Грознага, разважаць і даказваць свой пункт погляду, працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі.

**Метадычнае забеспячэнне:** Сусветная гісторыя Новага часу, XVI—XVIII стст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / пад рэд. У.С.Кошалева. Мн., 2010; раздатачны матэрыял; вучэбная насценная карта "Расійская дзяржава ў XVI ст."; Сусветная гісторыя Новага часу, XVI—XVIII стст. 7 клас. Атлас / І.А.Аўдзееў, У.С.Кошалеў. Мн., 2006.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

### План урока

I. Арганізацыйны этап.
II. Этап вывучэння новага матэрыялу.
1. Завяршэнне аб'яднання рускіх зямель.
2. Дзяцінства і юнацтва Івана Грознага.
3. Выбраная рада і рэформы 1550-х гг.
4. Ваенныя паходы Івана Грознага.
5. Апрычніна.
6. "Масква — трэці Рым".
III. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.
IV. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны этап.**

Пасля прывітання вучняў настаўнік звяртае іх увагу на змест вучэбнага дапаможніка (с. 207) і задае ім пытанні: 1. Як называецца трэці раздзел вучэбнага дапаможніка? 2. Колькі тэм змяшчае гэты раздзел? 3. Як называецца першая тэма па гісторыі Расіі ў трэцім раздзеле вучэбнага дапаможніка? ***(Адказ.** 1. Расія. 2. Шэсць тэм. 3. Расійская дзяржава ў XVI ст.)*

**II. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***1. Завяршэнне аб'яднання рускіх зямель.***

Пасля таго як вучні даведаліся пра тэму, якую яны будуць вывучаць на ўроку, настаўнік нагадвае вучням, што на пачатку XVI ст. Маскоўскае царства, або Расія, з'яўлялася вялікай і моцнай дзяр-



***ГАНЧАРЭНКА Наталля Аляксееўна.***

*Настаўніца гісторыі Высокаўскай сярэдняй школы імя Дняпроўскай флатыліі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Нарадзілася ў г. Пінск. У 1993 г. закончыла гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна. З гэтага года выкладае гісторыю і грамадазнаўства ў Высокаўскай сярэдняй школе. З'яўляецца кіраўніком школы эфектыўнага педагагічнага вопыту настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства Пінскага раёна, пераможца раённага этапа рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў "Настаўнік года Рэспублікі Беларусь 2014". Аўтар шэрагу метадычных публікацый.*

gisdaparnoga.bspu.by

жавай. Яго цэнтрам была Масква. У 1505 г. пры князі Васілі ІІІ была падпарадкавана Пскоўская зямля, пасля шматгадовых войнаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскім княствам у 1514 г. далучаны Смаленск. У 1521 г. канчаткова знішчана незалежнасць аднаго з самых старажытных рускіх княстваў — Разанскага. Так у XVI ст. у выніку праведзеных ваенных паходаў завяршылася фарміраванне тэрыторыі адзінай Расійскай дзяржавы.

Пасля свайго расказу настаўнік звяртае ўвагу вучняў на вучэбную гістарычную карту "Расійская дзяржава ў XVI ст." і прапаноўвае паказаць межы і сталіцу Расійскай дзяржавы, вызначыць, ці мела яна выхад у пачатку XVI ст. да Балтыйскага і Чорнага мораў. Вучні бачаць, што Расія не мела выхаду да Балтыйскага і Чорнага мораў. Настаўнік гаворыць вучням, што ў выніку такога становішча яна была адрэзаная ад еўрапейскага і сусветнага гандлю. У XVI ст. ёй давялося весці ўпартую барацьбу ў заходнім і паўднёвым напрамках каб далучыць новыя землі.

***2. Дзяцінства і юнацтва Івана Грознага.***

Настаўнік дэманструе вучням партрэт Івана Грознага і зачытвае эпіграф урока: "Сапраўдны ўладар той, хто валодае сабой, над кім не ўладараць захапленні і хто ўсё пакрывае любоўю" і адзначае, што гэтыя словы належаць сучасніку Івана IV мітрапаліту Маскоўскаму і ўсяе Русі Філіпу II. Па выніках вывучэння тэмы вучням неабходна будзе выказацца, ці можна такую ацэнку аднесці да дзяржаўнай дзейнасці Івана IV.

*Настаўнік.* У 1530 г. у сям'і вялікага князя Васіля ІІІ і вялікай княгіні Алены Глінскай нарадзіўся сын Іван. Калі Івану было тры гады, памёр яго бацька, праз чатыры гады памерла яго маці. Па загадзе Васіля ІІІ, да паўналецця Івана кіраваць краінай павінны былі баяры. Аднак яны пастаянна вялі барацьбу за ўладу паміж сабою. Пра тое, як праходзіла дзяцінства Івана ў такіх умовах, мы даведаемся з гістарычных крыніц.

Настаўнік прапаноўвае вучням самастойна прачытаць, як рускія гісторыкі В.В.Ключэўскі, М.М.Карамзін апісваюць дзяцінства будучага цара Івана IV і вызначаюць, чым яно было адметнае.

*Картка 1*

"От природы царь получил ум бойкий и гибкий, вдумчивый и немного насмешливый. Но обстоятельства, среди которых протекло детство Ивана, рано испортили этот ум, дали ему болезненное развитие. В детстве ему часто приходилось испытывать равнодушие или пренебрежение со стороны окружающих.

Выросший среди чужих, Иван рано усвоил себе привычку ходить оглядываясь и прислушиваясь. Это развило в нем подозрительность, которая с летами превратилась в глубокое недоверие к людям.

Он сам вспоминал после, как его с младшим братом Юрием в детстве стесняли во всём, держали как убогих людей, плохо кормили и одевали, все заставляли делать их насильно и не по возрасту.

...Безобразные сцены боярского своеволия и насилий, среди которых рос Иван, были первыми его впечатлениями. Они превратили его робость в нервную пугливость, из которой с годами развилась наклонность преувеличивать опасность". *(Ключевский В.О. "Курс русской истории. Лекция XXX" / http://historysibsuti.narod.ru/ivgroz3.htm.)*

*Картка 2*

"Иоанн был несчастнейшим сиротой державы Российской: ибо не только для себя, но и для миллионов готовил несчастье своими пороками... Бояре Шуйские старались привязать к себе Иоанна исполнением всех его детских желаний: непрестанно забавляли, тешили во дворце шумными играми, в поле звериною ловлей, развивая в нем наклонность к жестокости. Например, любя охоту, он (Иван) любил не только убивать диких животных, но и мучить домашних, бросал их с высокого крыльца на землю, а бояре говорили: "Пусть державный веселится!" Окружив Иоанна толпою молодых людей, смеялись, когда Иван бесчинно резвился с ними или скакал по улицам, давил жен и старцев, веселился их криком. Тогда бояре хвалили в нем смелость. Они не думали толковать ему святых обязанностей, ибо не исполняли своих, не пеклись о просвещении юного ума, ибо считали его невежество благоприятным их властолюбия". *(Карамзин Н.М. "История государства Российского" / http://istmat.info/node/21393.)*

Пасля вучням задаюцца пытанні: 1. Выкажыце сваё меркаванне, ці гуманна абыходзіліся з Іванам IV у дзяцінстве? 2. Па меркаванні расійскіх гісторыкаў, як гэта паўплывала на станаўленне яго характару?

*Настаўнік.* У 1547 г. Іван IV прыняў новы тытул — тытул цара. Ён урачыста каранаваўся ў Маскоўскім Крамлі. Расія стала царствам. Царскі тытул маскоўскага правіцеля павінен быў паказаць поўную палітычную незалежнасць дзяржавы. Акрамя таго, цар стаяў значна вышэй за сваіх падданых, у тым ліку і князёў.

***3. Выбраная рада і рэформы 1550-х гг.***

Настаўнік задае пытанні вучням: Як вы думаеце, пасля прыняцця царскага тытулу якія былі першыя крокі Івана IV як дзяржаўнага дзеяча? ***(Адказ. Ён пачаў праводзіць рэформы.)*** Якія могуць быць мэты рэформаў? ***(Адказ. Палепшыць** палітычнае і эканамічнае становішча дзяржавы і грамадства.)*

*Настаўнік.* Іван IV ажыццяўляе шэраг рэформаў. Распрацаваць і ажыццявіць рэформы цару дапамагалі таленавітыя саветнікі — Выбраная рада. "Выбраная" ад слова "выбіраць", "рада" ад слова "раіць". Цар Іван Грозны сам прызначаў членаў рады — баяр, якія давалі свае парады.

Для падрабязнага азнаямлення з рэформамі вучням прапануецца прачытаць у вучэбным дапаможніку 2—4 абзацы п. 3 "Выбраная рада" (с. 127-128), назваць, што азначаюць паняцці "Судзебнік", "прыказы", "Земскі сабор", і пералічыць рэформы, якія былі праведзены ў Расійскай дзяржаве ў 1550-я гг.

Пасля таго як вучні прачыталі тэкст пункта 3 настаўнік арганізоўвае гутарку па пытаннях: 1. Што такое Судзебнік? 2. Што такое прыказы і для чаго яны былі створаны? 3. Якія былі створаны прыказы? 4. Што такое Земскі сабор? 5. Ці можна лічыць Земскі сабор саслоўна-прадстаўнічым органам? 6. Чым Земскі сабор адрозніваўся ад англійскага парламента? *(Адказ. 1. Агульнарасійскі звод законаў. 2. Установы, якія кіравалі асобнай галіной і здзяйснялі выкананне законаў. 3. Пасольскі, памесны, разрадны, чалабітны, разбойны і інш. 4. Сход баяр, духавенства і дваран. 5. Часткова. 6. Земскі сабор ніколі не абмяжоўваў уладу манарха.)*

Абагульняючы адказы вучняў, настаўнік пералічвае рэформы, праведзеныя ў 1550-я гг., вызначае ролю, якую яны адыгралі ў гісторыі Расіі — садзейнічалі фарміраванню цэнтралізаванай дзяржавы, сістэмы кіравання, стварэнню пастаяннага войска, росту гарадоў, развіццю гаспадаркі. Далей арганізоўвае запаўненне схемы "Рэформы 1550-х гг. у Расійскай дзяржаве".

*4. Ваенныя паходы Івана Грознага.*

Настаўнік арганізоўвае вывучэнне ваенных паходаў Івана Грознага па насценнай вучэбнай гістарычнай карце "Расійская дзяржава ў XVI ст." з дапамогай пытанняў: Пагладзіце на ўмоўныя абазначэнні і вызначыце, у якіх напрамках арганізоўваліся паходы рускіх войскаў у XVI ст.? *(Адказ. Заходнім, паўднёвым, усходнім напрамках.)* З якімі ханствамі ваявала Расія? *(Адказ. З Астраханскім, Казанскім, Сібірскім.)*

*Настаўнік.* З Масквы рускімі войскамі было здзейснена тры паходы на Казань. Першыя два паходы былі няўдалыя — горад Казань быў добра умацаваны. Аднак рускія войскі зрабілі падкоп пад сценамі горада, узарвалі сцены і праз пралому праніклі ў горад. Казань была далучаная да Маскоўскага царства, усе жыхары прысягнулі на вернасць Івану IV. Астрахань здалася без бою. Астраханскі хан прызнаў васальную залежнасць ад Івана IV.

Пасля далучэння да Расіі Паволжа пачалося пакарэнне Сібірскага ханства. Эканамічнае значэнне гэтых зямель вялікае — яны былі багаты жалезнай рудой, серабром, пушнінай. Пакарэнне Сібіры адбывалася ў вельмі цяжкіх суровых умовах. Казацкаму атаману Ермаку, які ўзначальваў паход, удалося выйграць бітвы з сібірскім ханам дзякуючы свайму ваеннаму таленту. Заваяванне Сібіры адбывалася некалькі гадоў. У 1583 г. Заходняя Сібір была далучана да Расіі.

Далей настаўнік задае вучням пытанні: 1. Паглядзіце на карту і адкажыце, калі былі далучаныя да Расіі Казанскае, Астраханскае, Сібірскае ханствы? 2. Якое ханства знаходзілася на ўсходзе ад Расіі? 3. Ці можна лічыць паходы Івана IV у

*Схема*

**Рэформы 1550-х гг. у Расійскай дзяржаве**

| Прававая рэформа | Ваенная рэформа | Рэформа цэнтральнага кіравання | Рэформа мясцовага кіравання | Адміністрацыйная рэформа |
|---|---|---|---|---|
| 1550 г. — стварэнне Судзебніка — агульна-расійскага зводу законаў | 1550 г. — стварэнне стралецкага войска | Стварэнне прыказаў — органаў цэнтральнага дзяржаўнага кіравання (пасольскі, памесны, разрадны, чалабітны, разбойны і інш.) | Ажыццяўленне судовых мерапрыемстваў выбарнымі старастамі | Збіранне Земскага сабора — сходу прадстаўнікоў баяр, дваран, духавенства |

**Мэты: фарміраванне цэнтралізаванай дзяржавы, сістэмы кіравання, пастаяннага войска.**



gisdapamoga.bspu.by

паўднёвым і ўсходнім напрамках удалымі? 4. Якія ваенныя паходы ажыццявіў Іван IV? 5. Якое мора знаходзіцца на захад ад Расіі? 6. Хто перашкаджаў Расіі мець свой выхад да мора? *(Адказы. 1. 1552, 1556, 1583 гг. 2. Сібірскае. 3. Так, таму што пры Іване IV значна пашыралася тэрыторыя дзяржавы. 4. У заходнім. 5. Балтыйскае мора. 6. Лівонскі ордэн.)*

*Настаўнік.* Вайна ў Прыбалтыцы за выхад Расіі да Балтыйскага мора атрымала назву Лівонскай. Яна распачалася ў 1558 г. і доўжылася да 1583 г. На карце "Лівонская вайна 1558—1583 гг." вызначыце, войскі якіх дзяржаў удзельнічалі ў гэтай вайне. *(Адказ. Рускія, войскі Польскага Каралеўства і ВКЛ, лівонскія, шведскія войскі.)* На пачатку вайны Расія разграміла Лівонскі ордэн. Аднак у вайну супраць Расіі ўступілі ВКЛ, Польшча, Швецыя. На тэрыторыі ВКЛ галоўны ўдар быў нанесены па Полацку. У 1563 г. царскія войскі спалілі і разрабавалі горад, знішчылі вялікую колькасць людзей. Вайна супраць Маскоўскага царства з'яўлялася адной з прычын аб'яднання ВКЛ і Польшчы ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую. У 1582 г. Расія заключыла перамір'е на 10 гадоў з Рэччу Паспалітай, на тры гады са Швецыяй.

Настаўнік пасля кароткага апісання падзей Лівонскай вайны прапануе па карце "Лівонская вайна 1558—1583 гг." вызначыць: Ці дасягнула Расія сваёй мэты — выхаду да Балтыйскага мора? Якія краіны атрымалі ў выніку баявых дзеянняў новыя тэрыторыі? *(Адказ. Не. Атрымалі тэрыторыі Рэч Паспалітая, Швецыя, Данія.)* Далей настаўнік адзначае, што вайна каштавала Расіі вялікіх ахвяр, гібелі людзей і спусташэння краіны.

***5. Апрычніна.***

Пры вывучэнні гэтага пункта плана настаўнік гаворыць вучням, што часы кіравання Расійскай дзяржавай Іванам Грозным сталі сімвалам дэспатызму вярхоўнай улады. Яшчэ ў часы Лівонскай вайны ў 1560 г. цар адмовіўся ад парад Выбранай рады. Адсутнасць вынікаў рэформаў, няўдачы ў Лівонскай вайне выклікалі ў цара вялікае незадавальненне. Перыяд расійскай гісторыі з 1565 па 1572 г. вядомы як апрычніна. Ён зазначае вучням, што ў адным з летапісаў пра апрычніну запісана так: "Царь учиниша опричнину и оттого было запустение великое Русской земли". Затым вучням прапануецца прагледзець відэасюжэт "Адкуль узялася апрычніна" *(http://www.1tv.ru/shows/dobroe-utro/mezhdu-tem/otkuda-vzyalas-oprichnina)*, вызначыць, што такое апрычніна, яе прычыны, хто яе праводзіў і супраць каго, пацвердзіць прыкладамі прыведзенае летапіснае выказванне.

Настаўнік пасля прагляду відэасюжэта падагульняючы выказванні вучняў, зазначае, што апрычніна дала магчымасць Івану IV бязмежна ўзмацніць сваю ўладу, аднак прывяла да шматлікіх бедстваў, нястачы, збяднення і разарэння розных слаёў насельніцтва, да вялікіх людскіх ахвяр. Каб прадухіліць уцёкі сялян і адпаведна разарэнне служылых людзей, Іван Грозны ў 1581 г. увёў так званыя "запаветныя гады" — гады, на працягу якіх сялянам забаранялася сыходзіць ад свайго гаспадара. Гэта паклала пачатак запрыгоньванню сялян.

***6. "Масква — трэці Рым".***

Настаўнік прапануе вучням самастойна прачытаць у вучэбным дапаможніку п. 6 "Масква — трэці Рым", разгледзець ілюстрацыю "Вялікая дзяржаўная пячатка Івана IV з выявай дзяржаўнага герба ў акружэнні гербаў асобных зямель і раскрыць сэнс тэорыі "Масква — трэці Рым". На падставе аналізу пячаткі і тэксту вучні робяць высновы аб дзяржаўным ладзе Расійскай дзяржавы ў XVI ст., вызначаюць ролю Маскоўскага княства ў ім і характарызуюць становішча далучаных да Масквы зямель.

**III. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.**

Настаўнік з мэтай арганізацыі замацавання вывучанага матэрыялу прапануе вучням пералічыць, калі і якія палітычныя і эканамічныя мерапрыемствы былі здзейснены Іванам IV (прыняцце царскага тытула ў 1547 г., выданне Судзебніка 1550 г., правядзенне разнастайных рэформаў, пашырэнне тэрыторыі Расійскай дзяржавы, правядзенне ў 1565—1572 гг. апрычніны), вызначыць, якія вынікі мела праўленне Івана IV для дзяржавы (завяршэнне аб'яднання паўночнаўсходніх зямель вакол Масквы, складванне адзінай Расійскай дзяржавы, цэнтралізаваная арганізацыя органаў дзяржаўнага кіравання).

Далей настаўнік звяртае ўвагу вучняў на партрэт Івана IV Грознага і эпіграф урока "Сапраўдны ўладар той, хто валодае сабой, над кім не ўладарыць захапленні і хто ўсё пакрывае любоўю" і прапануе выказаць сваё меркаванне, наколькі ён можа адпавядаць Івану IV як дзяржаўнаму дзеячу. Потым вучням прапануецца паразважаць над пытаннем: "Іван Грозны — хто ён? Геній або злодзей?". Настаўніку неабходна падкрэсліць, што трэба быць аб'ектыўнымі да гістарычнай асобы.

*Настаўнік.* Іван IV Грозны — гэта асоба ў гісторыі супярэчлівая і трагічная. Нягледзячы на тое, што Іван IV умацаваў краіну, пашырыў яе межы, ажыццявіў цэнтралізацыю ўлады, мы не можам апраўдаць тыя сродкі, якімі ён карыстаўся. Ніякімі вялікімі мэтамі нельга апраўдаць бясчынствы над сваім народам.

**IV. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.** Прачытаць § 21 вучэбнага дапаможніка, адказаць на пытанні на с. 131.



gisdapamoga.bspu.by